*Кацярына Баброўская*

# ФАЛЬКЛОРНЫЯ КАЛЕКТЫВЫ БЕЛАРУСІ КАНЦА XX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯЎ

У апошняй трэці XX – пачатку XXI стагоддзяў з узростам глабалізацыі ў свеце з’явіліся некаторыя пагрозы для выжывання традыцыйнай культуры, на што паўплывала змяненне светапогляду і побыту народа. Найбольш істотныя сярод іх наступныя:

1) дэміфалагізацыя – інтэпрытацыя міфалагічнай асновы народнай творчасці згодна з уяўленнямі сучаснага гарадскога чалавека;

2) дэсакралізацыя – абясцэньванне сакральных традыцыйных узораў, рэлігійных уяўленняў, светапогляду людзей;

3) разбурэнне міжпакаленных сувязей у працэсе перадачы культурных традыцый ад старэйшага пакалення малодшаму;

4) адрыў ад прыроднага асяроддзя, перасяленне носьбітаў традыцыі з вёскі ў горад;

5) змена характару вытворчасці − ад калектыўных форм ручной працы (напрыклад, на полі) да машыннай вытворчасці;

6) пераход самаарганізавальных форм культурнага жыцця ў арганізаваныя і інстытуцыіраваныя.

Да чаго гэта прывяло? Як вызначаліся фальклорныя калектывы? І якія тэндэнцыі сучаснага развіцця народнага мастацтва мы назіраем сёння?

Яшчэ да 1980-х гадоў у Беларусі у населеных пунктах з традыцыйным укладам жыцця (вёсках, мястэчках і інш.) самастойна існавалі аўтэнтычныя фальклорныя калектывы. Галоўнай адметнасцю іх была манера выканання, захаванне дыялектнай асновы твораў і напеўныя мелодыі, якія адрозніваліся паміж сабой рэгіянальнымі асаблівасцямі. Паколькі музычнай граматай вясковыя выканаўцы не валодалі, то і адназначнага падзелу на галасы ў песнях не існавала. Быў «запявала», які пачынаў «заводзіць» песню, і тыя, што вялі асноўны напеў ніжняга голасу – «басы», а выканаўца верхняга сольнага голасу рабіў «падводку» [1, *389*]. Для аўтэнтычных калектываў не існавала паняцця «танальнасці» і замацаванасці за ёю песні. Удзельнікі гурта спявалі, гледзячы на свае галасавыя магчымасці. Часам першы куплет пачынаўся ў адной варыяцыі, быццам бы «запявала» шукаў найбольш прыемны тон для свайго голасу. Далей уступалі іншыя спевакі, якія маглі змяніць мелодыю і тэмп. Удзельнікі гурта спявалі «на слых» так, як чулі некалі ад сваіх бацькоў, родных, сваякоў, якія раней выконвалі гэтыя песні ў іх вёсках.

Аўтэнтычныя калектывы спявалі акапэльна. Часам ім падыгрывалі мясцовыя музыкі-самавукі на бубнах, дудачках, свістульках, трашчотках, бразготках і іншых простых самагучальных інструментах. На вялікія святы маглі запрашацца вандруючыя артысты з разнастайнымі старадаўнімі скрыпкамі, лірай, гуслямі, смыкамі, цымбаламі. У першай палове XX ст. у

музычны побыт паступова ўводзяцца завадскія інструменты: гармонік, цымбалы, скрыпка. З гэтага часу пачынаецца змена выканальніцкай манеры і рэпертуару гуртоў. Удзельнікі пачыналі спяваць ужо пад заданы тон інструмента, у сувязі з чым знікае імправізацыя і свабода пошуку напеву. Найбольш старадаўнія песні паступова пачынаюць замяняцца простымі песеннымі формамі і жанрамі: прыпеўкамі, жартоўнымі песнямі і інш.

Удзельнікамі аўтэнтычных гуртоў з'яўляюцца людзі сталага або старэйшага ўзросту: мясцовыя знаўцы традыцыі, найбольш таленавітыя і паважаныя людзі вёскі, якія генетычна звязаны з натуральным фальклорным асяроддзем пэўнай мясцовасці і атрымалі свае веды і ўменні шляхам вуснай перадачы ад папярэдняга пакалення. Касцюмы і іншыя этнаграфічныя атрыбуты тут заўсёды самабытныя, мясцовыя, старадаўнія. Як правіла, аўтэнтычныя калектывы прымалі ўдзел у абрадах сямейнага (радзіны, вяселле, пахаванні) і каляндарнага цыклаў, а з сярэдзіны ХХ ст. і ў прафесійных святах, грамадскіх урачыстасцях.

З сярэдзіны 1980-х гадоў назіраецца псеўдакіраванне аўтэнтычнымі фальклорнымі калектывамі. Пачынаецца асваенне фальклорнай спадчыны мастацкай самадзейнасцю, якое набывае характар шырокага сацыякультурнага руху. Так, у ліку нехарактэрных для мясцовых калектываў асаблівасцей з'яўляецца:

• выкарыстанне нетыповых музычных інструменатаў: разнастайных баянаў, скрыпак, акардэонаў;

• замены рытмаў і тэмпаў;

• зварот да рэпертуару іншых мясцовасцей і нацыянальнасцей;

• скарачэнні тэкстаў песень і пераапрацоўка больш складаных мелодый у простыя, якія б лёгка прыстасаваліся да акампанементу.

Паколькі новыя кіраўнікі такіх калектываў мелі харавую адукацыю, то строй, манера спеваў пачалі змяняцца. Галасы ўсіх удзельнікаў кіраўнік падзяляў на высокія і нізкія жаночыя галасы і мужчынскія галасы (трохгалоссе). Для іх спецыяльна прапісваюцца партыі – партытура. Удзельнікамі калектываў пад эгідай новага кіраўніка становяцца розныя па ўзросту, сацыяльнаму становішчу, адукацыі людзі. Такім чынам, самабытныя аўтэнтычныя калектывы прыпадабняюцца да тыповых самадзейных харавых ансамбляў, адрываюцца ад традыцый мясцовага рэгіёну, губляюць сваю самастойнасць, скіроўваючыся на выкананне рэпертуару на сцэнічных пляцоўках Беларусі ў разнастайных пераапрацоўках. Сярод найбольш цікавых харавых калектываў пры сельскіх клубах і раённых дамах культуры вылучаюць:

– Тонежскі народны (з 1984 г.) хор сельскага Дома культуры Лельчыцкага раёна;

– Ананьчыцкі народны (з 1985 г.) фальклорна-этнаграфічны хор Салігорскага раёна;

– Воранаўскі народны (з 1985 г.) ансамбль народнай музыкі «Лявоны».

У другой палове ХХ ст. пачынаюць сваю дзейнасць прафесійныя фальклорныя калектывы, якія існуюць да сённяшняга часу. Іх рэпертуар

складаюць беларускія народныя песні розных рэгіёнаў Беларусі і песні іншых народаў у апрацоўках кампазітараў, кіраўнікоў калектываў, а таксама аўтарскія творы. Такія калектывы ўзнікаюць на базе філармоніі і знаходзяцца пад яе апекай, якая дае магчымасць мець упарадкаваны на год гастрольны графік па тэрыторыі Беларусі і за яе межамі. Сярод буйнейшых вылучаюць:

− Беларускі дзяржаўны харэаграфічны ансамбль «Харошкі» (створаны ў 1974 г.);

− Беларускі дзяржаўны ансамбль народнай музыкі «Свята» (заснаваны ў 1984 г.);

− Ансамбль народнай музыкі Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі «Бяседа» (заснаваны ў 1991 г.).

Канцэртныя нумары прафісійных ансамбляў могуць аб’ядноўвацца ў цэласныя тэатралізаваныя праграмы пэўнай тэматыкі. Напрыклад, праграмы «Тураўская легенда», «Полацкі сшытак» ансамбля «Харошкі». У творчасці такіх калектываў фальклорны нацыянальны пачатак спалучаецца з сучаснай рытмікай і экспрэсіяй, артыстызмам і прафесіяналізмам. Як правіла, удзельнікамі з’яўляюцца выпускнікі вышэйшых культурных адукацыйных установ, вучылішчаў, прафесійныя артысты. Эскізы іх стылезаваных касцюмаў распрацоўваюцца прафесійнымі мастакамі і дызайнерамі, спалучаючы у сабе элементы розных народных строяў.

Прафесійным фальклорным калектывам уласцівы наступныя рысы:

• строгі падзел жаночых галасоў харавой групы на сапрана першыя і другія, альты першыя і другія, мужчынскіх – на тэнара, барытоны, басы;

• апрацоўка музычнага матэрыялу, дабаўленне да народнай песні іншых галасоў, акордаў, сугуччаў;

• унутранае дзяленне калектываў на інструментальную, вакальную і танцавальную групы;

• інструментальная група прадстаўлена не толькі традыцыйнымі беларускімі народнымі інструментамі (дудачкі, жалейкі, цымбалы, бубны), але і сучаснымі (электрагітары, бас-гітары, сінтэзатары, электронныя барабаны і інш.);

• адсутнасць дыялектных асаблівасцей у тэкстах песень, падпарадкаванне тэксту літаратурнай мове;

• удакладненне сэнсавых націскаў, устанаўленне дынамікі песні, выпрацоўка агульнай дыкцыі, дасягненне рытмічнасці ансамбля.

У гэты ж час у сталіцы і буйных гарадах Беларусі шырока распаўсюджваюцца аматарскія фальклорныя калектывы, якія існуюць у форме гуртоў, калектываў, ансамбляў пры клубах, Дамах і Палацах культуры, установах адукацыі. Як правіла, іх удзельнікі займаюцца мастацкай творчасцю на грамадскіх пачатках, добраахвотна, за выключэннем кіраўніка калектыву, які працуе на прафесійнай аснове. Ён жа займаецца пошукам фестываляў, арганізацыяй канцэртаў, месцаў правядзення рэпетыцый. Паміж сабой аматарскія ансамблі адрозніваюцца падыходам да фарміравання рэпертуару, ступенню яго стылізацыі, творчай пераапрацоўкай і аранжыроўкай. Большасць іх развіваецца па прафесійным узоры і

арыентуецца на сцэнічныя формы ўвасаблення. Асноўнае месца ў музычным рэпертуары займаюць танцавальныя найгрышы і вясельныя маршы рознага этнічнага і сацыяльнага паходжання, у песенным рэпертуары – апрацаваныя ўзоры народнага мастацтва, інструментальнае суправаджэнне якіх характарызуецца рытмічнасцю напеваў. Паколькі такія калектывы не маюць непасрэднага кантакту з носьбітамі традыцый, то часам яны не скіроўваюць сваю ўвагу на мясцовыя дыялектныя асаблівасці мастацкай спадчыны. Народнае шматгалоссе тут строга размежавана паводле рэгістраў гучання галасоў, як і ў прафесійных калектывах. Інструментальны склад даволі шырокі: скрыпка, цымбалы, баян, гармонік, жалейка, дуда, колавая ліра, барабан, кантрабас, часам выкарыстоўваюцца бас-гітары, сінтэзатар. Навучанне ў іх вядзецца вусным шляхам, выкарыстоўваюцца пісьменныя фальклорныя першакрыніцы (тамы серыі БНТ), аўдыё- і відэазапісы фальклорных экспедыцый.

У 1980-90-я гг. некаторыя аматарскія калектывы атрымоўваюць званне «народны», а з цягам часу дасягаюць найвышэйшага звання – «заслужаныя». Напрыклад:

– Міханавіцкі ўзорны дзіцячы фальклорны ансамбль «Калыханка» Дома фальклору Мінскага раёна (заснаваны ў 1989 г.);

– Іванаўскі заслужаны аматарскі ансамбль народнай музыкі і песні «Палешукі» (заснаваны ў 1986 г.);

– Мінскі фальклорны вакальна-харэаграфічны ансамбль «Валачобнікі» (заснаваны ў 1979 г.);

– Мінскі заслужаны аматарскі ансамбль беларускай песні «Церніца» (заснаваны ў 1978 г.);

– Мінскі аматарскі заслужаны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш» (заснаваны ў 1980 г.);

– Магілёўскі заслужаны аматарскі ансамбль беларускай песні «Медуніца» (заснаваны ў 1989 г.);

– Крупіцкі заслужаны (народны з 1986 г.) аматарскі фальклорны ансамбль «Крупіцкія музыкі».

У канцы ХХ ст. кіраўнікі аўтэнтычных, прафесійных і аматарскіх калектываў з розных рэгіёнаў Беларусі, паддаючыся уплыву поп-культуры, пачалі рабіць больш простыя пераапрацоўкі танцаў і песень, што прывяло да нівеліравання рэпертуару, да аднабаковай манеры спеваў. Калектывы сталі падобнымі адзін да аднаго канцэртнымі праграмамі, рэжысёрскімі пастаноўкамі, манерай выканання, інструментальнай апрацоўкай. За гады папулярызацыі фальклору выпрацавалася аднолькавая псеўдафальклорная манера спеваў. Яна характарызуецца адкрытасцю гука, паколькі выканаўца спявае на галасавых звязках, выкарыстоўваючы адкрытую гартань [2]. Такім чынам, фальклarысты і кіраўнікі калектываў забыліся пра шматграннасць народных спеваў розных рэгіёнаў Беларусі: антыфонныя, дыяфонныя, спевы з «пералівамі», спевы з «падводкай», галасныя, двухгалосныя, трох- і чатырохгалосныя.

Харавыя калектывы пачалі страчваць сваю арыгінальнасць, і з 1990-х гадоў на сцэне з'яўляюцца меншыя па колькасці ўдзельнікаў гурты з аўтэнтычным гучаннем беларускіх песень. Разам з тым з канца XX ст. узнікаюць стылізатарскія фальклорныя калектывы. Гэтаму садзейнічалі творчыя і аўтарскія перааапрацоўкі прафесійных кампазітараў і кампазітараў-аматараў. Рэпертуар калектываў арыентуецца на грамадскі попыт, разлічаны на зацікаўленасць шырокага кола насельніцтва. Якасць стылізацыі фальклору залежыць ад дасведчанасці аўтара аб фальклорным стылі і яго жанравай спецыфіцы, наяўнасці фальклорнага вопыту і ведаў. Стылізацыя – гэта, па сутнасці, аднаўленне, узнаўленне істотных рыс, імітацыя, капіраванне арыгіналу з мэтай зацікавіць, прывабіць сучаснага слухача, гледача. Розныя стылізаваныя віды і жанры ў апрацоўках, аранжыроўках захоўваюць функцыю фальклорнай першаасновы, не пераходзяць у формы прафесійнага мастацтва і могуць функцыянаваць ва мовах любога горада ці вёскі. Для іх характэрна:

• пераасэнсаванне традыцый, мастацкіх асаблівасцей фальклору;

• абагульненасць істотных агульнанацыянальных рыс;

• спрашчэнне рэпертуару, адрыў ад рэгіянальных асаблівасцей, што праяўляецца на сюжэтна-змястоўным, а не на стылявым узроўні;

Галоўнай задачай стылізацыі фальклору з'яўляеццца максімальная выразнасць гучання, эмацыянальнасць, часам не на карысць праўдзівасці і натуральнасці. Усе неістотныя дэталі адкідваюцца, а характэрныя прыкметы наўмысна акцэнтуюцца. Такім чынам, стылізатарскія фальклорныя калектывы адрозніваюцца ад аўтэнтычных умовамі стварэння і функцыянавання. Яны разлічаны на шырокую публіку, арыентуюцца на грамадскі попыт, не маюць строгай арэальнай прывязкі.

Сярод найбольш знакамітых стылізатарскіх фальклорных калектываў вылучаюць:

– Тэатр фальклору «Дзіва» (заснаваны ў 1982 г.);

– Мінскі традыцыйны этна-фольк гурт «Гуда» (заснаваны ў 1994 г.);

– Ансамбль беларускай музыкі «Ветах» (заснаваны ў 1997 г.).

З канца XX стагоддзя пачалі ўзнікаць эксперыментальныя фальклорныя калектывы, якія:

• адраджаюць і асвойваюць жанры традыцыйнага фальклору;

• дзейнічаюць на сцэнічных пляцоўках розных фестываляў, канцэртаў;

• узнаўляюць сапраўдныя дыялектныя стылі фальклору;

• не капіруюць аўтэнтычны фальклор, а спасцігаюць і асэнсоўваюць мастацкі прататып сучасным метадам аналізу, перааапрацоўкі і інтэрпрэтацыі;

• эксперыментуюць у вобласці спалучэння народных традыцый з сучаснымі музычнымі і песеннымі накірункамі.

Удзельнікі эксперыментальных калектываў не з'яўляюцца носьбітамі пэўнай лакальнай традыцыі. Яны маюць разнастайную музычную адукацыю і засвойваюць рэпертуар у працэсе працы з традыцыйнымі творамі мастацтва. У сваёй аснове такія калектывы – гарадскія гурты, якія прытрымліваюцца разнастайных стыляў аранжыраванага фальклору: фольк-рок, фольк-мадэрн,

індзі-фольк, неафольк, фольк-прагрэсіў, фольк-метал, этна-фьюжан, этна-джаз і інш. Першыя спробы падобнага сінтэзу фальклора былі зроблены вакальна-інструментальным ансамблем «Песняры» пад кіраўніцтвам У. Мулявіна (1969 г.). У сваіх апрацоўках ансамбль выкарыстоўваў шасці-васьміголоссе, электроннае музычнае гучанне. Далейшым развіццём пераапрацоўкі і адаптацыі народных песень пачалі займацца:

– «Палац», стыль – фольк-рок, фольк-модерн, заснаваны ў 1992 г.;
– Этна-трыа «Троіца», стыль – world-music, 1995 г.;
– «Крыві», стыль – арт-мадэрн-фольк, 1997 г.;
– «Юр'я», стыль – этна-мадэрн, 1999 г.;
– «Бан-жвірба», стыль – фольк-рок, 1999 г.;
– «Osimira», стыль – world-music, этна-шоў, 2002 г.
– «Akana-NHS», стыль – этна-джаз, 2003 г.

Эксперыментальныя фальклорныя калектывы адрозніваюцца камерцыйнай накіраванасцю і спробай апрацаваць народную песню або мелодыю з дапамогай сучасных музычных накірункаў (рок, поп, джаз, метал, панк, індзі, электрык), чаго ніколі не зробіць аўтэнтычны выканаўца, які захоўвае спеўныя традыцыі, назапашаныя за стагоддзі.

У сувязі з росквітам стылізацыі і эксперыментальнасці некаторыя фальклярысты бачаць перспектыву развіцця народнай песні толькі ва ўзнаўленні аўтэнтычнага фальклору, абмяжоўваючы, такім чынам, права кіраўнікоў на мастацкі пошук. Але на наш погляд, традыцыя не закасцянелая, назаўсёды застылая з'ява. Яна можа і павінна заяўляць пра сябе ў розных формах, на рознай музычнай мове.

Такім чынам, мы вылучаем пяць тыпаў фальклорных калектываў канца XX – пачатку XXI стагоддзяў, якія размяжоўваюцца па ступені пераймання народнай манеры спеваў і харэаграфіі, па напрамках папулярызацыі фальклору, па характары апрацоўкі традыцыйнага матэрыялу і якасці выканання твораў:

1) аўтэнтычныя гурты;
2) аматарскія фальклорныя калектывы;
3) прафесійныя ансамблі;
4) стылізатарскія фальклорныя калектывы;
5) сучасныя эксперыментальныя калектывы.

Большасць фальклорных калектываў для фарміравання свайго музычнага і песеннага рэпертуару карыстаюцца:

• асабістымі запісамі, зробленымі падчас фальклорна-этнаграфічных экспедыцый;
• зборам тамоў серыі «Беларуская народная творчасць»;
• архіўнымі матэрыяламі фоналабараторыі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН РБ;
• архіўнымі запісамі клуба «Фальклор» Рэспубліканскага радыё (Т. Песнякевіч);
• фонаархівам этнамузыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (ФЭЭ БДАМ) і інш.

Трэба адзначыць, што з 1980-х гадоў на тэлебачанні існавалі фальклорныя праграмы: «Запрашаем на вячоркі» (1987-2003 гады), «Спявай, душа», «Песні маёй краіны» (2009 год, 2012 год), «Наперад у мінулае» (з 2012 года).

З канца XX ст. па ўсёй тэрыторыі Беларусі пачалі праводзіцца разнастайныя фальклорныя фестывалі, грамадска-культурныя акцыі, скіраваныя на захаванне і прапаганду гісторыка-культурнай спадчыны, адраджэнне, актуалізацыю і падтрымку традыцыйных форм народнага мастацтва як асноўнай часткі нацыянальнай культуры. Яны падзяляюцца паводле жанраў і відаў (спеўныя, інструментальныя, харэаграфічныя і інш.), адміністрацыйна-тэрытарыяльнага і геаграфічнага прынцыпу і маштабах правядзення на міжнародныя, рэспубліканскія, абласныя, раённыя і гарадскія.

Найбольш папулярныя:

– Усебеларускі фестываль народнага мастацтва «Беларусь – мая песня» (праводзіцца з 1997 г.);

– Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» (праводзіцца з 1998 г.);

– Рэспубліканскі фестываль сучаснага фальклору «Таўкачыкі» (праводзіцца з 2000 г.);

–Міжнародны беларускі музычны фестываль «Вольнае паветра» (праводзіцца з 2006 г.);

– Міжнародны беларускі фестываль фальклорнай музыкі «Камяніца» (праводзіцца з 2009 г.).

На наш погляд, палітыка дзяржавы, праграмы і праекты Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі і іншых установаў павінны быць скіраваны на захаванне спадчыны Беларусі. На стварэнне ўмоў для развіцця розных калектываў – аўтэнтычных, аматарскіх, прафесійных, стылізаваных і эксперыментальных, на падтрымку іх фінансавымі фондамі, грантамі, на распрацоўку новых праектаў зберажэння спадчыны, забяспечаных разнастайнымі фестывалямі і акцыямі. На жаль, сёння такіх праграм на Беларусі вельмі мала.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Беларускі фальклор: Энцыкл. У 2 т. Т. 1: Акапэла – Куцця / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.] – Мінск: БелЭн, 2005.

2. Народное пение // Любителям петь. Сайт для любителей петь: советы, теория и практика [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://liketosing.ru/narodnoe-penie. – Дата доступа: 09.01.14

3. Википедия. Свободная энциклопедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ru.wikipedia.org/wiki. – Дата доступа 19.03.14